Гістарычнае падарожжа “Промні асветніцтва” (па матывах тэлевізійнай гульні ”Разумнікі і разумніцы”, прысвечаная Дню беларускага пісьменства.

**Мэты:**

паглыбіць веды вучняў пра гісторыю беларускага пісьменства і друку;

развіваць уважлівасць, кемлівасць, уменне сцісла і лаканічна выказваць свае думкі;

стварыць умовы для выхавання ў вучняў цікавасці да гісторыі роднага краю.

**Форма правядзення:** гульня “Разумнікі і разумніцы”

**Абсталяванне:** партрэты Францыска Скарыны, Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага; вышываныя ручнікі; чырвоныя зорачкі з паперы.

**Месца правядзення:** кабінет інфарматыкі

**Ход мерапрыемства.**

**1. Арганізацыйны момант.**

**2. Слова вядучага.**

**Выступленні вучняў.**

—Ты адкуль бруішся,
Мова?..
—З сініх нёманскіх крыніц...
Па зямлі збіраю словы,
Нібы россыпы суніц.
Мілая, адзіная,
Нам, нашчадкам,
Дадзена
Любаю Радзімаю
Ад дзядоў і прадзедаў.
Хай вядзьмараць Навальніцы,
Снегападаў касякі,
А табе вякі бруіцца —
А затым —
Яшчэ вякі!..

Мы жывем у краіне, якая завецца Рэспубліка Беларусь. Кожны чалавек павінен ведаць і памятаць: адкуль ён родам, хто яго продкі.

Мы-славяне! Рускія, і ўкраінцы, балгары і беларусы, чэхі і палякі, сербы, харваты і славакі – усе мы славяне. У славян ёсць свята “Дзень славянскай пісьменнасці”. А ў нашай рэспубліцы святкуецца яшчэ і нацыянальнае свята “Дзень беларускага пісьменства і друку”.

Ідэя свята заключаецца ў тым, каб паказаць цесную сувязь беларускага друкаванага слова з яго славянскімі вытокамі, з гісторыяй

беларускага народа.

Свята праводзіцца ў гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі, з якімі звязаны жыццё і дзейнасць вядомых дзеячаў літаратуры, культуры, мастацтва. Упершыню, у 1994 годзе, яно праходзіла ў старажытным горадзе Полацку. Затым сталіцамі свята сталі такія гістарычна значныя культурныя цэнтры краіны, як Тураў, Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Заслаўе, Мсціслаў, Мір, Камянец, Паставы, Шклоў, Барысаў, Смаргонь, Хойнікі, Ганцавічы, Глыбокае.

За сваю шматгадовую гісторыю Дзень беларускага пісьменства стаў па-сапраўднаму нацыянальным святам, значнай падзеяй культурнага жыцця краіны. Сёлета свята адзначалася ў горадзе Івацэвічы Брэсцкай вобласці.

*Прагляд відэароліка пра святочныя мерапрыемствы да Дня беларускага пісьменства ў*

*Прагляд відэароліка "Адкуль да нас прыйшла кніга"*

***Настаўнік.*** Сёння мы таксама далучымся да святочных мерапрыемстваў
і правядзём гульню "Разумнікі і разумніцы" пад назвай "Промні асветніцтва". На працягу тыдня вашай увазе была прадстаўлена інфармацыя "З гісторыі беларускага пісьменства і друку". А зараз гэта гульня дапаможа выявіць узровень вашых ведаў па дадзенаму пытанню.

А зараз нам патрэбна выбраць траіх назіральнікаў, якія будуць дапамагаць вядучаму ў ходзе гульні.

**3. Пешы адборачны тур.**

Пытанні:

1. Узнікненне якога першага дзяржаўнага ўтварэння на беларускіх землях выклікала патрэбу ў **ведах і пісьменнасці? /Полацкае княства/**

2. Якая азбука пачала асвойвацца на Полацкай зямлі ў 11 стагоддзі **/кірылічная/**

3. Кірылічная азбука *была* складзена ў 863 г. і ўтрымлівала 43 літары. А хто склаў дадзеную азбуку? /браты Кірыл і Мяфодзій/

**Пытанні для ўдзельнікаў першага тура.**

1.Якія помнікі пісьменства былі знойдзены археолагамі ў Віцебску і Мсціслаўлі? / **берасцяныя граматы/**

2.Як называецца запіс падзей па гадах (летах) у храналагічнай паслядоўнасці./летапісанне/

3.У пачатку XII ст. манахам Нестарам была створана летапіс, які змяшчае звесткі аб Рагвалодзе, Рагнедзе, Ізяславе, Усяславе Чарадзеі, бітве на Нямізе і іншых падзеях з жыцця ўсходніх славян. Як называўся гэты летапіс? /**«Аповесць мінулых гадоў»/**

4.Якая кніга лічыцца самай ранняй рукапіснай кнігай на тэрыторыі

Беларусі /**«Тураўскае евангелле»**/

5.Матэрыял для рукапісных кніг, спецыяльна вырабленая скура цялят./**пергамент/**

6.Як звалі ўнучку знакамітага князя Усяслава Чарадзея? **/Прадслава, Еўфрасіння Полацкая/**

7.Колькі часу ў перыяд Сярэднявечча трацілася на перапісванне адной кнігі?/ **на перапісванне адной кнігі звычайна патрабавалася ўсё жыццё/.**

8. Які рэлігійны подзвіг здзейсніла Еўфрасіння на схіле жыцця?/ **адправілася ў далёкае і цяжкае падарожжа ў Святую зямлю - Іерусалім, дзе і памерла/**

9. Якая дата абрана вернікамі для адзначэння дня памяці Еўфрасінні Полацкай? **/5 чэрвеня**

**4. Другі адборачны тур.**

Пытанні:

1.Назавіце імя выдатнага рэлігійнага асветніка, які на пэўны час замураваўся ў невялічкай манастырскай вежы (стаўпе, які меў некалькі паверхаў) і жыў пустэльнікам? **/Кірыла Тураўскі/**

2.Як за красамоўства празвалі яшчэ пры жыцці Кірылу Тураўскага? **/Залатавустам/**

3. Якая мова да 17 ст. была дзяржаўнай у ВКЛ? **/старабеларуская/**

**Пытанні для ўдзельнікаў другога тура.**

1. Назавіце імя беларускага і ўсходнеславянскага гуманіста, першадрукара і асветніка, вучонага і пісьменніка./ **Францыск Скарына/**

2. Назавіце горад, у якім нарадзіўся Скарына? **/Полацк/**

3. У колькі гадоў Скарына скончыў Кракаўскі ўніверсітэт?/ **у 16 гадоў/**

4. У 1512 г. Скарына паспяхова здаў экстэрнам (без навучання) экзамен на ступень доктара медыцыны ў Падуанскім універсітэце. У якой краіне знаходзіцца дадзены ўніверсітэт? **/у Італіі/**

5. У якім горадзе 6 жніўня 1517 г. Ф. Скарына ***першы сярод усходніх славян*** выдаў друкаваную кнігу — Біблію. **/ у чэшскім горадзе Прага/**

6. А хто з'яўляецца першаадкрывальнікам друкарскай справы ў Заходняй Еўропе? / ***Іаган Гутэнберг/***

7. Якую дэталь Ф. Скарына тройчы надрукаваў у выдадзеных ім кнігах? Гэта адзіны выпадак за ўсю гісторыю выданняў Бібліі ва Усходняй Еўропе. /**уласны партрэт**/

8. У якім горадзе на радзіме (ВКЛ) Скрына працягнуў сваю друкарскую дзейнасць? /**у Вільні**/

9. Якая кніга была выдадзена Скарынам у 1522 годзе? /**«Малая падарожная кніга»/**

10. Якая кніга была выдадзена Скарынам у 1525 годзе?/ **«Апостал»/**

**5. Падвядзенне вынікаў.**

Вось і скончылася наша гульня. Давайце яшчэ раз павіншуем пераможцаў. Дадзеныя вучні атрымаюць адзнаку “10” па беларускай літаратуры.

Ці спадабалася вам гульня?